способности, и что очень актуально в дошкольном возрасте — умение самостоятельно приобретать новые знания [3, с. 318]. Практика показала, что при активном внедрении информационных коммуникационных технологий посредством инновационного интерактивного оборудования, значительно возрастает интерес детей к занятиям, повышается уровень познавательных возможностей. Использование новых непривычных приёмов объяснения и закрепления, тем более в игровой форме, помогают приблизить образовательный процесс к практике повседневной жизни, формируют не только знания, умения и навыки, но и активную жизненную позицию.

**Заключение.** Системная работа по использованию информационных коммуникационных технологий при организации образовательного пространства посредством инновационного интерактивного оборудования показывает, что обучающиеся демонстрируют более высокий уровень формирования интегративных качеств и естественного вхождения в мир взрослых, в завтрашний мир. Педагогическому сообществу доступно ещё одно средство развития, и его надо профессионально и умело использовать в нашей практике.

**Список цитируемых источников**

1. Инструктивно-методическое письмо Министерства образования Республики Беларусь. Приоритетные направления деятельности системы дошкольного образования в 2017/2018 учебном году. — URL: http://www.edu.gov.by/page-23621 (дата обращения: 26.06.2024).

2. *Комарова, Т. С.* Информационно-коммуникативные технологии в дошкольном образовании / Т. С. Комарова, А. В. Туликов. — М. : Мозаика Синтез, 2011. — 30 с.

3. *Абасова, С. Э.* Современные информационно-коммуникационные технологии образования / С. Э. Абасова, С. Г. Абдуллаев // Новые информационные технологии в образовании : материалы международной научно-практической конференции: в 2-х ч.: Ч. 1. — Екатеринбург: РГППУ, 2011. — 318 с.

УДК 378

**Жалнерчык Алена Іванаўна**
*Дзяржаўная ўстанова адукацыі «Дзіцячы сад аг. Ёдкі», аг. Ёдкі, Рэспубліка Беларусь,*
*edki-detsad@edu-lida.gov.by*

## ФОРМЫ І МЕТАДЫ РАБОТЫ ПА МАРАЛЬНА-ПАТРЫЯТЫЧНАМУ ВЫХАВАННЮ ДЗЯЦЕЙ ДАШКОЛЬНАГА ЎЗРОСТУ

У арыкуле падымаецца праблема выхавання патрыятычных пачуццяў у дашкольнікаў. Вопыт работы выхавацеля дашкольнай адукацыі па выкарыстанню эфектыўных форм і метадаў работы па маральна-патрыятычнаму выхаванню дзяцей дашкольнага ўзросту. Раскрываецца значнасць узаемадзеяння ўстановы дашкольнай адукацыі з сям'ёй.

**Ключавыя словы:** дашкольнік; маральна-патрыятычнае выхаванне; сям'я.

**Zhalnerchik Alyona Ivanovna**
*State Educational Institution "Kindergarden of Yodki", Lida district, agro-town Yodki, Republic of Belarus,*
*edki-detsad@edu-lida.gov.by*

## FORMS AND METHODS OF WORK ON MORAL AND PATRIOTIC EDUCATION OF PRESCHOOL CHILDREN

The paper raises the problem of nurturing patriotic feelings among preschoolers. The article describes the experience of a preschool teacher in using effective forms and methods of work on the moral and patriotic education of preschool children. Unveils the importance of the interaction of the preschool educational institution with the family.

**Key words:** preschooler; moral and patriotic education; family.

**Уводзіны.** У сучасных умовах, калі адбываюцца найглыбокія змены ў жыцці грамадства, адным з галоўных накірункаў работы з дзецьмі становіцца маральна-патрыятычнае выхаванне. Педагагічная дзейнасць установы дашкольнай адукацыі накіравана на фарміраванне ў дзяцей дашкольнага ўзросту ўяўленняў аб родным краі, станоўчых адносін да яго, далучэнне да агульначалавечых і нацыянальных каштоўнасцей, пазнання гісторыі і культуры свайго народа, выхавання гонара за сваю краіну, беларускі народ. Выхаванне пачуцця патрыятызму ў дзяцей дашкольнага ўзросту — крапатлівая праца, якая павінна весціся сістэматычна, планамерна, ва ўсіх узроставых групах, розных відах дзейнасці і па розных

© Жалнерчык А. І., 2025

Репозиторий БарГУ

напрамках. Вялікае значэнне ў патрыятычным выхаванні мае сістэма работы, змест якой складаецца з розных форм і спосабаў арганізацыі, а для рэалізацыі задач патрыятычнага выхавання выкарыстоўваюцца эфектыўныя метады і прыёмы, сродкі выхавання [1, с. 3].

**Асноўная частка.** Змест работы па маральна-патрыятычнаму выхаванню і развіццю нацыянальнай самасвядомасці мы будавалі на аснове ўяўленняў дашкольнікаў пра родны край і адносін да яго: гісторыі, культуры. Тэматычнае планаванне з'яўляецца неабходнай умовай для мэтанакіраванай працы, дазваляе ўсталёўваць лагічныя сувязі паміж рознымі накірункамі: «Наш дзіцячы сад», «Мая сям'я», «Падарожжа па сцяжынках гісторыі Беларусі», «Сімвалы Рэспублікі Беларусь», «Вядомыя мясціны Беларусі», «Славутыя імены беларускай зямлі», «Дзяржаўныя і народныя святы», «Беларуская народная творчасць», «Мая малая радзіма».

У рабоце з малодшымі дашкольнікамі асаблівую ўвагу надавалі развіццю ўяўленняў аб блізкім сацыяльным асяроддзі, выкарыстоўвалі такія метады і прыёмы, як арганізацыя жыццёвых і гульнявых сітуацый, якія даюць магчымасць асвойваць вопыт добразычлівага стаўлення да блізкіх, дарослых; інсцэніроўкі з цацкамі, якія дэманструюць узоры ўзаемаадносін у дзіцячым садзе і ў сям'і («Да нас прыйшлі госці», «Мы ў дзіцячым садзе» і інш.); назіранне за дзеяннямі дарослых ва ўстанове дашкольнай адукацыі («Прафесіі дарослых у дзіцячым садзе», «Каму што патрэбна для работы?»); карагодныя гульні, гульні-імітацыі («Заінька за садочкам», «Грушка», «А мы проса сеялі» і інш.); чытанне вершаў, пацешак, казак на тэму дабрыні, любові да бацькоў; разгляданне ілюстрацый, сюжэтных карцінак з выявай сям'і, сямейных фатаздымкаў і інш.

У сярэдняй групе ўключалі дзяцей у размовы пра сям'ю, сямейныя падзеі. Захаплялі дзяцей гульні на сямейныя тэмы, дзе разгортваюцца розныя сюжэты з жыцця: «Сямейныя традыцыі», «Дзень нараджэння ў сям'і», «Мы едзем на адпачынак», «Наш выхадны дзень». Знаёмілі выхаванцаў з вершамі, песенькамі, у якіх адлюстроўваюцца падзеі з жыцця сям'і, праца бацькоў. Арганізоўваліся сітуацыі «добрых спраў»: рабілі падарункі бацькам на святы «8 Сакавіка», «Дзень матулі», «Дзень Абаронцаў Айчыны».

Старэйшы дашкольны ўзрост з'яўляецца найбольш спрыяльным перыядам для фарміравання ўяўленняў аб родным краі, станоўчых адносін да яго, авалодання дзецьмі беларускай народнай культурай, калі ў дашкольнікаў закладваюцца асновы грамадзянскасці, развіваецца цікавасць да Радзімы на эмацыйна-пачуццёвым узроўні [2, с. 45; 3].

У рабоце з дзецьмі старэйшага дашкольнага ўзросту выкарыстоўвалі наступныя метады і формы арганізацыі патрыятычнага выхавання:

– пазнавальныя гутаркі аб родным краі, роднай краіне, свеце («Мы — маленькія грамадзяне», «Хто такія знакамітыя людзі Рэспублікі Беларусь», «Прырода роднага краю», «Беларусь на карце свету» і іншыя);

– экскурсіі, мэтавыя прагулкі, назіранні за дзейнасцю людзей і грамадскімі падзеямі («Архітэктура роднага краю», «Мой горад Ліда», «Прафесіі жыхароў нашага аграгарадка»);

– разгляданне ілюстрацый аб асаблівасцях прыроды Беларусі, розных краін; знаёмства з дэкаратыўна-прыкладным мастацтвам Беларусі; абмеркаванне і складанне апавяданняў аб прафесіях бацькоў і гараджан;

– гульнявыя праблемна-пошукавыя сітуацыі («Звычайнае—незвычайнае», «Чаму ў народзе так кажуць?», «Як жылі нашы продкі?», «Чаму Беларусь называюць сінявокай?» і інш.);

– дыдактычныя і сюжэтна-ролевыя гульні («Пазнай па апісанні», «Складзі з пазлаў», «Назаві па-беларуску», «Знайдзі пару», «У падзорную трубу гляджу — усё, што бачу, раскажу», «Майстэрня ўмельцаў», «Мая сям'я» і іншыя);

– чытанне мастацкай літаратуры; працоўныя даручэнні, працоўныя акцыі («Зробім пляцоўку прыгожай», «Наш утульны куток», «Пасадзі дрэва», «Хатка для птушак»).

Пры знаёмстве дзяцей дашкольнага ўзросту з гісторыяй роднага горада, даводзіцца шмат расказваць, таму пры складанні апавядання звярталі ўвагу на такія моманты: па ходзе апавядання неабходна выкарыстоўваць наглядны матэрыял (фатаграфіі, рэпрадукцыі карцін, схемы, ілюстрацыі), рабіць малюнкі мелам на дошцы. Складаючы апавяданне, трэба ўключыць пытанні да дзяцей, неабходныя для актыўнай пазнавальнай дзейнасці, навучаць разважаць, у гэтым выпадку расказ выхавацеля ператвараецца з маналогу ў своеасаблівую гутарку з дзецьмі. Расказваючы пра нейкія гістарычныя падзеі, не варта часта ўжываць даты, бо ў дашкольным узросце дзецям недаступная храналогія, але, каб дзеці зразумелі, што падзеі адбываліся даўно, варта ўжываць такія выразы «гэта было вельмі-вельмі даўно», «гэта было тады, калі вашы таты і мамы былі маленькімі» і г. д. Мова апавядання павінна быць простай, калі ў апавяданні сустракаюцца незнаёмыя дзецям словы, трэба растлумачыць іх значэнне.

У працэсе знаёмства дашкольнікаў са славутасцямі роднага горада, Рэспублікі Беларусь расказвалі аб розных архітэктурных збудаваннях, храмах. У гэтым выпадку, дастаткова вылучыць тое галоўнае, што адрознівае той ці іншы будынак. Свае ўяўленні і пачуцці ад убачанага і пачутага дашкольнікі адлюстроўвалі ў працэсе арганізацыі выяўленчай дзейнасці: «Прыгажосць беларускай прыроды», «Святочны горад», «У ганчарнай майстэрні», «Прафесіі бацькоў», «Сімвалы Рэспублікі Беларусь», «Я малюю сваю краіну».

У сучасным жыцці да нас паступова вяртаецца нацыянальная памяць, і мы па-новаму пачынаем ставіцца да старажытных свят, традыцый, фальклору, мастацкіх промыслаў, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, таму мы ў сваей рабоце шырока выкарыстоўвалі ўсе віды фальклору (казкі, песенькі, пры-

Рэпазіторый БарГУ

казкі, прымаўкі і г. д.). У вуснай народнай творчасці як нідзе захаваліся асаблівыя рысы беларускага характару, уласцівыя яму маральныя каштоўнасці, уяўленні пра дабро, прыгажосць, праўду, адвагу, працавітасць. Вялікае месца ў далучэнні дзяцей да народнай культуры займаюць народныя святы і традыцыі, у якіх адлюстроўваюцца назапашаныя стагоддзямі назіранні за характэрнымі асаблівасцямі пораў года, зменамі надвор'я, паводзінамі птушак, насякомых, раслін, звязаныя з працай і рознымі бакамі грамадскага жыцця чалавека. З вялікім задавальненнем дзеці прымалі ўдзел у музычных святах: «Дажынкі», «Каляда», «Купалле».

Народныя гульні таксама адыгрываюць важную ролю ў маральна-патрыятычным выхаванні дзяцей дашкольнага ўзросту, у іх адлюстроўваецца лад жыцця людзей, іх праца, побыт, нацыянальныя асновы. Дзеці з вялікім задавальненнем гулялі ў народныя гульні: «Гарлачык», «Блін гарыць», «Вузельчык», «Кот Максім», «Янка і Марылька» і іншыя.

Аналіз тэорыі і практыкі ў галіне нацыянальнага развіцця і маральна-патрыятычнага выхавання паказвае, што традыцыйныя формы і метады, якія выкарыстоўваюцца ва ўстановах дашкольнай адукацыі, патрабуюць дапаўнення інавацыйнымі тэхналогіямі. Асаблівую ўвагу неабходна надаць арганізацыі актыўных відаў дзейнасці, у якой дзеці папоўняць асабісты вопыт для паспяховага пераноса ў рэальнае жыцце, на практыку. Метад праектаў адзін з перспектыўных метадаў, які садзейнічае вырашэнню праблемы маральна-патрыятычнага выхавання, развівае пазнавальную цікавасць, фарміруе навыкі супрацоўніцтва. Асноўная яго мэта — развіццё свабоднай творчай асобы дзіцяці, магчымасць адчуць сябе даследчыкам, аб'яднаць дзяцей і бацькоў. З гэтай мэтай распрацавалі наступныя педагагічныя праекты: «Па сцяжынках гісторыі Беларусі», «Сімвалы Рэспублікі Беларусь», «Народная мудрасць нам пакажа».

Выкарыстанне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій — актуальны і эфектыўны сродак для маральна-патрыятычнага выхавання дзяцей дашкольнага ўзросту. Інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі выкарыстоўвалі пры разглядзе нагляднага матэрыялу, праглядзе мультымедыйных прэзентацый, мультфільмаў, праслухоўванні песень і вершаў, арганізацыі віртуальных экскурсій.

Вялікую ўвагу надавалі рабоце з бацькамі. Для таго, каб бацькі сталі актыўнымі памочнікамі выхавацеля ў патрыятычным выхаванні дзяцей неабходна ўключыць іх у жыццё ўстановы дашкольнай адукацыі. Неабходнасць уключэння сям'і да азнаямлення дашкольнікаў з сацыяльным асяроддзем тлумачыцца адмысловымі педагагічнымі магчымасцямі, якімі валодае сям'я і якія не можа замяніць дашкольная ўстанова: любоў і прыхільнасць да блізкіх людзей, да роднага краю, эмацыйна-маральная насычанасць адносін, іх грамадская, а не эгаістычная накіраванасць. Работа з сям'ёй з'яўляецца складанай задачай як у арганізацыйным, так і ў псіхолага-педагагічным плане. Развіццё такога ўзаемадзеяння мы спланавалі ў некалькі этапаў.

Першы этап — дэманстрацыя бацькам станоўчага вобразу дзіцяці, дзякуючы чаму паміж бацькамі і выхавацелямі складваюцца добразычлівыя адносіны з устаноўкай на супрацоўніцтва. Значнасць дадзенага этапу вызначаецца тым, што часта бацькі фіксіруюць сваю ўвагу толькі на негатыўных праявах развіцця і паводзін дзіцяці.

На другім этапе бацькам былі прапанаваны практычныя веды па выхаванні патрыятычных пачуццяў у дзіцяці. У пачатку работы з бацькамі і дзецьмі па патрыятычнаму выхаванню правялі анкетаванне «Патрыятычнае выхаванне дзіцяці ў сям'і», пры дапамозе якога было выяўлена разуменне сутнасці патрыятычнага выхавання бацькамі і іх стаўленне да ўзаемадзеяння ўстановы дашкольнай адукацыі і сям'і ў гэтым напрамку. Вынікі анкетавання паказалі, што пад патрыятычным выхаваннем бацькі разумеюць любоў да роднага краю, да старэйшага пакалення, выхаванне павагі да традыцый і звычаяў свайго народа. Яны адзначылі, што адказнасць за патрыятычнае выхаванне дзяцей нясуць у роўнай ступені і бацькі, і педагогі дашкольнай адукацыі. Многія бацькі валодаюць асобаснымі якасцямі, якія могуць служыць станоўчым прыкладам у выхаванні першых пачуццяў патрыятызму ў дашкольнікаў, аднак яны маюць жаданне пашыраць і паглыбляць існуючыя веды.

Па выніках анкетавання падрыхтавалі кансультацыі: «Выкарыстанне беларускага фальклору ў выхаванні станоўчых пачуццяў да роднага краю», «Роля сям'і ў выхаванні патрыятычных пачуццяў у выхаванцаў», «Першыя пачуцці патрыятызму», «Як знаёміць дзяцей з сімволікай Рэспублікі Беларусь». Распрацавалі памяткі і рэкамендацыі для бацькоў: «Далучэнне дзяцей да народных гульняў», «Выхаванне ў дзяцей маральна-патрыятычных пачуццяў», «Любі сваю хатку, як родную матку».

Па запыту бацькоў распрацавалі маршруты выхаднога дня па памятных месцах горада Ліда, картатэку дыдактычных гульняў па патрыятычнаму выхаванню, картатэку народных гульняў.

З вялікім задавальненнем бацькі прынялі ўдзел у мерапрыемствы «Бацькоўскія вячоркі», у ходзе якога яны праявілі актыўнасць, падзяліліся сямейным вопытам ў пытаннях патрыятычнага выхавання, расказалі пра свае сямейныя традыцыі, пра радавод сям'і, пра арганізацыю выхадных дней разам з дзецьмі па памятных месцах Лідчыны і Лідскага раена.

У дзень адчыненых дзвярэй «Беларусь мая сінявокая» бацькі мелі магчымасць разам з дзецьмі далучыцца да творчасці беларускіх пісьменнікаў, пазнаеміцца з творамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва народных майстроў роднага краю. Дома яны сумесна гатавалі беларускія стравы.

Рэпазіторый БарДУ

Значнай падставай у выхаванні патрыятычных пачуццяў у дашкольнікаў з'явілася арганізацыя і правядзенне святаў «Дзень Абаронца Айчыны« і «8 Сакавіка», дзе бацькі прынялі актыўны ўдзел.

З дапамогай бацькоў падрыхтаваны расказы пра гісторыю вуліц, на якіх яны жывуць, іх былыя назвы, прыгожыя будынкі. Гэта з'явілася падставай для захапляючай суменай дзейнасці бацькоў і выхаванцаў, у ходзе якой дзеці атрымалі новыя веды пра гісторыю і культуру роднага краю. Вялікая колькасць нагляднай інфармацыі (фотаздымкі, паштоўкі) спрыяла арганізацыі фотавыставы «Ліда — горад майго дзяцінства», «Па прасторах роднага аграгарадка», «Беларускія краявіды».

Адначасова бацькі дапамаглі пазнаёміць дзяцей са сваімі прафесіямі, дзякуючы намаганням якіх аграгарадок набывае своеасаблівую прыгажосць. Гэта дало ўсведамленне таго, што ад кожнага жыхара залежыць будучыня роднага месца. Сумесна з дзецьмі і дарослымі былі праведзены акцыі «Зробім наш край чыстым і прыгожым», «Пасадзі дрэва».

**Заключэнне.** Поспеху ў патрыятычным выхаванні можна дасягнуць толькі тады, калі самі дарослыя будуць ведаць і любіць гісторыю сваёй краіны, свайго аграгарадка. Яны павінны ўмець адабраць тыя веды, якія даступныя дзецям дашкольнага ўзросту, тое, што можа выклікаць у дзяцей пачуццё захаплення і гонару. Але ніякія веды не дадуць станоўчага выніку, калі дарослы сам не будзе захапляцца сваёй краінай, сваім народам, сваей малой радзімай. Пры нараджэнні дзіця — чысты ліст, малюй на ім, што хочаш. Вось і пакідаюць на гэтым лісце свой след усе, хто знаходзіцца побач з дзіцем. Добра, калі тыя, з кім мае зносіны маленькі чалавек, разумныя, добрыя, высокамаральныя людзі.

Патрыятызм — гэта пачуццё любові да Радзімы. Духоўны, творчы патрыятызм трэба прывіваць з ранняга дзяцінства. Але падобна любому іншаму пачуццю, патрыятызм здабываецца самастойна і перажываецца індывідуальна. Ён непасрэдна звязаны з асабістай духоўнасцю чалавека, яе глыбінёй. Таму, не будучы патрыётамі самі, дарослыя не змогуць і ў дзіцяці абудзіць пачуццё любові да Радзімы, менавіта абудзіць, а не навязаць, бо ў аснове патрыятызму ляжыць духоўнае самавызначэнне.

**Спіс цытаваных крыніц**

1. Праз старажытнасць — у будычыню. Аранізацыя працэса патрыятычнага выхавання ва ўстанове дашкольнай адукацыі : дапам. для педагогаў дашк. адукацыі / Л. М. Варанецкая [і інш.]. — 3-е выд. — Мазыр : Выснова, 2023. — 203 с.
2. *Красіла, А. І.* Мой край завецца Беларуссю : дапам. для педагогаў устаноў, якія забяспечваюць атрыманне дашкол. адукацыі / А. І. Красіла. — Мазыр: Белы вецер. 2004. — 160 с.
3. Об утверждении учебной программы дошкольного образования / постановление Мин-ва образования Респ. Беларусь от 04.08.2022 № 229 // Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь, 25.08.2022, 8/38589. — URL: https://pravo.by/-document/?guid=12551&p0=W22238589p (дата обращения: 27.12.2024).

УДК 376

**Журун Юлия Анатольевна**
*Государственное учреждение специального образования «Центр коррекционно-развивающего обучения и реабилитации Барановичского района», Барановичи, Республика Беларусь, yulya.zhurun@mail.ru*

# ОСОБЕННОСТИ ОРГАНИЗАЦИИ ПРЕДМЕТНО-РАЗВИВАЮЩЕЙ СРЕДЫ ОБУЧАЮЩИХСЯ С ОСОБЫМИ ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫМИ ПОТРЕБНОСТЯМИ НА I СТУПЕНИ ОБЩЕГО СРЕДНЕГО ОБРАЗОВАНИЯ

Для максимального раскрытия потенциальных возможностей личности учащегося, содействия его развитию в личностном и познавательном плане необходимо создание специальной предметно-развивающей среды. Нужно думать не только об усвоении знаний, умений, навыков, а ещё и о развитии высших психических функций (памяти, внимания, восприятия, мышления), при помощи которых ребёнок будет усваивать учебную программу в будущем. Специалисты, работающие с учащимися с особыми образовательными потребностями, обязаны дать им шанс жить полноценной жизнью.

**Ключевые слова:** учащиеся; особые образовательные потребности; предметно-развивающая среда.

**Zhurun Yuliya Anatolevna**
*State Institution of Special Education "Center for Correctional and Developmental Training and Rehabilitation of the Baranovichi District", Baranovichi, Republic of Belarus, yulya.zhurun@mail.ru*

# FEATURES OF ORGANIZING A SUBJECT-DEVELOPING ENVIRONMENT FOR STUDENTS WITH SPECIAL EDUCATIONAL NEEDS AT THE 1st LEVEL OF GENERAL SECONDARY EDUCATION

In order to fully reveal the potential of a student's personality, to promote his/her development in personal and cognitive terms, it is necessary to create a special subject-developing environment. It is necessary to think not only about the acquisition of knowledge, skills,

© Журун Ю. А., 2025

Репозиторий БарГУ